# ДЭФЕКТАЛОГІЯ

УДК 376.36

*Л. А. Зайцава, Н. М. Баль*

## Асаблівасці граматычнага афармлення выказванняў малодшымі школьнікамі з цяжкімі парушэннямі маўлення

Праблема фарміравання граматычнага ладу маўлення дзяцей з'яўляецца адной з важнейшых у агульнай і спецыяльнай педагогіцы. Гэта звязана з той выключнай роляй, якую выконваюць граматычныя сродкі мовы ў працэсе маўленчай камунікацыі. Авалодванне дзіцем граматычнымі заканамернасцямі забяспечвае магчымасць задаволення яго камунікатыўна-дзейнасных патрабаванняў і пазнання навакольнай рэчаіснасці. Граматычная кампетэнтнасць як здольнасць распазнаваць лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці мовы і свабодна дзейнічаць з імі на ўзроўні словазлучэння і сказа з'яўляецца значнай складовай камунікатыўнай кампетэнцыі, фарміраванне якой выступае актуальнай задачай сучаснай школы [1].

Несфарміраванасць граматычнага ладу — адзін з істотных недахопаў вучняў школ для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення (ЦПМ). Асноўным кантынгентам дадзенага тыпу школ з'яўляюцца дзеці з агульным недаразвіццём маўлення (АНМ). Вырашэнне задачы фарміравання граматычнага ладу маўлення ў гэтых вучняў звязана з шэрагам цяжкасцяў, бо граматычная сістэма з'яўляецца найбольш складанай часткай засваення мовы, а адхіленні ў авалодванні і прымяненні граматычных заканамернасцяў вельмі трывалыя і цяжка паддаюцца карэкцыі.

Парушэнне граматычнага ладу мовы — аграматызм — адзін з асноўныхі самых трывалых сімптомаў АНМ (В. К. Вераб'ёва, В. Я. Грыбава, Н. С. Жукава, У. А. Коўшыкаў, Р. Я. Левіна, А. Ф. Сабатовіч, Л. Ф. Спірава, С. М. Шахаўская, С. Б. Якаўлеў, К. Г. Ярмілава і інш.). Дзеці з АНМ, валодаючы абмежаваным наборам слоў і граматычных канструкцый, сустракаюцца з цяжкасцямі ў адборы моўнага матэрыялу, які адпавядае той ці іншай мэце выказвання. Гэта выступае прычынай спецыфічнага дысгарманічнага фарміравання ў іх маўленчых уменняў і навыкаў [2].

У мэтах распрацоўкі дыферэнцыраваных прыёмаў карэкцыі парушэнняў маўленчага развіцця неабходна выяўленне асаблівасцяў авалодвання граматычнай сістэмай мовы, праяўленняў аграматызму ў розных катэгорый вучняў з ЦПМ. Асноўнай задачай даследавання з'явілася параўнальнае вывучэннне магчымасцяў граматычнага афармлення выказванняў на сінтаксічным узроўні ў вучняў малодшых класаў з рознай маўленчай паталогіяй. Было абследавана 118 вучняў класаў і школ для дзяцей з ЦПМ. З улікам клінічнай класіфікацыі АНМ, намі былі вылучаны тры эксперыментальныя групы: дзеці з няўскладненым варыянтам АНМ (46 вучняў); з дызартрыяй, ускладненай АНМ (37 вучняў); з маторнай алаліяй (35 вучняў). Усе дзеці на момант даследавання мелі АНМ III узроўню (па сістэматызацыі Р. Я. Левінай). Кожная група дзялілася на дзве падгрупы: вучні падрыхтоўчага і I класаў (7—9 год) і вучні IV класа (11—13 год).

Даследаванне было накіравана на вывучэнне асаблівасцяў пабудовы сказаў па апорных словах; па сюжэтных малюнках; па асобных словах, якія знаходзіліся ў беспарадку.

Аналіз пабудовы сказаў **па апорных словах** вучнямі з няўскладненым АНМ выявіў у 73,6 % першакласнікаў і 88,6 % чацвёртакласнікаў правільна сканструяваныя выказванні, што сведчыць аб найлепшых магчымасцях дадзенай катэгорыі дзяцей у складанні сказаў у параўнанні з іншымі. Так, толькі 56,8 % вучняў I класаў і 75,3 % вучняў IV класаў з маторнай алаліяй змаглі граматычна і семантычна правільна скласці сказы. Трэба адзначыць, што дзеці з маторнай алаліяй радзей за іншых будавалі развітыя і складаныя сказы. Колькасць такіх сказаў, складзеных вучнямі з няўскладненым АНМ і дызартрыяй, ускладненай АНМ, вагаецца ад 36,7—44,1 % (I клас) да 71,6—74,4 % (IV клас). У вучняў з маторнай алаліяй гэты паказчык склаў толькі 12,9 % (I клас) і 53,9 % (IV клас). Гэта ўказвае на значныя цяжкасці ў выкарыстанні набору сінтаксічных сувязяў, тыпаў сказаў ва ўсіх вучняў з ЦПМ, асабліва з маторнай алаліяй.

Пры пабудове развітых сказаў дзеці часцей за ўсё выкарыстоўвалі неразгорнутыя спрошчаныя канструкцыі, у якіх рэдка ўжываліся больш за 1—2 дадзеныя члены: *Я кормлю собачку. Дедушка строит дом.* Акрамя таго, некаторыя вучні складалі граматычна правільна аформленыя, але бяссэнсавыя сказы: *Я очень другая. Доброта сидит на окне.* Трэба адзначыць, што такога тыпу сказы сустракаліся ў вучняў з маторнай алаліяй (9,5—10,0 % адказаў), адносна рэдка — у дзяцей з дызартрыяй, ускладненай АНМ (3,4—3,6 % адказаў). Наяўнасць сказаў з парушаным сэнсам у маўленні вучняў сведчыць аб цяжкасцях у наладжванні імі не толькі сінтагматычных і парадыгматычных сувязяў паміж лексічнымі адзінкамі.

Даследаванне паказала, што аграматызм (скажэнне структуры сказаў, парушэнне прыназоўнікава-склонавых канструкцый і г. д.) больш распаўсюджаны ў выказваннях вучняў I класа ў параўнанні з вучнямі IV класа. Так, колькасць сказаў з аграматызмам у першакласнікаў вагаецца ад 6,4 % у дзяцей з дызартрыяй, ускладненай АНМ, да 8,4 % у вучняў з няўскладненым АНМ і 8,8 % у вучняў з маторнай алаліяй. Да чацвёртага класа ў дзяцей з няўскладненым і ўскладненым АНМ назіраецца станоўчая дынаміка ў выкарыстанні граматычна правільна пабудаваных фраз: колькасць аграматычных сказаў паніжаецца да 2,5 % у дзяцей з няўскладненым АНМ і 4,7 % у вучняў з дызартрыяй. У маўленні чацвёртакласнікаў з маторнай алаліяй аграматызм павялічваецца да 11,9 % і застаецца трывалым і выражаным праяўленнем АНМ. Гэта пацвярджаюць даныя Л. Ф. Спіравай аб тым, што з павелічэннем аб'ёму сказа, з колькасным ростам слоў у ім прыкметна ўзрастае колькасць граматычных памылак [3, с. 97].

Вывучэнне асаблівасцяў складання сказаў **па сюжэтных малюнках**, падабраных для выяўлення ўмення дзяцей будаваць розныя тыпы сінтаксічных канструкцый, паказала, што колькасць развітых сказаў у вучняў з няўскладненым АНМ склала 70,4 % (I клас) і 81,4 % (IV клас). У вучняў з дызартрыяй дадзены паказчык быў ніжэй: 68,4 % — у вучняў I класа і 79,2 % — IV класа. Самыя нізкія вынікі ў канструяванні развітых сказаў былі зафіксаваны ў дзяцей з маторнай алаліяй (40,0 % і 69,2 % адпаведна гадам навучання). Характэрна, што колькасць складаных сінтаксічных канструкцый, складзеных чацвёртакласнікамі з маторнай алаліяй, прыкладна роўна колькасці такіх жа сказаў, пабудаваных вучнямі I класа з няўскладненым і ўскладненым АНМ.

Пабудова выказванняў з апорай на сюжэтныя малюнкі, якая патрабавала ад вучняў выкарыстання сказаў розных тыпаў (беспрыназоўнікавых і прыназоўнікавых, з аднароднымі членамі, са злучальнай і падпарадкавальнай сувязямі), прывяла да шматлікіх і разнастайных праяўленняў аграматызму. Найбольш часта аграматычныя сказы сустракаліся ў вучняў з маторнай алаліяй (34,3 % — у першакласнікаў і 10,2 % — у чацвёртакласнікаў), радзей — у дзяцей з з няўскладненым АНМ (16,6 % і 8,3 % — адпаведна гадам навучання) і з дызартрыяй, ускладненай АНМ (11,9 % і 9,5 %).

Даследаванне асаблівасцяў пабудовы выказванняў **па асобных словах, размешчаных у беспарадку**, паказала, што аднаўленне дэфармаваных сказаў з'яўляецца самым цяжкім з трох прапанаваных заданняў для першакласнікаў з ЦПМ. Найбольш

нізкі вынік выяўлены ў вучняў першага класа з маторнай алаліяй: толькі 12,6 % сказаў былі складзены імі правільна. Дзеці з няўскладненым і ўскладненым АНМ, што навучаюцца ў I класе, паказалі прыкладна аднолькавыя вынікі (22—23 % правільных адказаў). Цяжкасці ў праграміраванні сказаў і іх граматычным афармленні з дадзенага набору слоў адзначаліся ў вучняў IV класа: толькі ў 51—53 % выпадкаў чацвёртакласнікі з няўскладненым і ўскладненым АНМ пабудавалі правільныя сказы. У вучняў з маторнай алаліяй дадзены паказчык быў яшчэ ніжэй (43,5 %).

У названых групах назіраліся сказы з аграматызмам. Менш за ўсё такіх сказаў было знойдзена ў вучняў з дызартрыяй, ускладненай АНМ (21,6 % адказаў першакласнікаў і 13,9 % — чацвёртакласнікаў). Трохі большая колькасць такіх выказванняў у вучняў з няўскладненым АНМ (22,4 % — у I класе і 18,8 % — у IV). Часцей за ўсё аграматычныя сказы сустракаліся ў дзяцей з маторнай алаліяй, пры гэтым колькасць фраз такога тыпу да IV класа памяншалася нязначна (ад 26,6 % у першакласнікаў да 23,1 % у чацвёртакласнікаў). З'ява аграматызму назіралася ў дзяцей нават у тых заданнях, дзе выкарыстоўваліся высокачастотныя словы з канкрэтным значэннем. Характэрнымі з'явіліся цяжкасці аб'яднання слоў у сказы, парушэнні лінейнага разгортвання выказванняў, неўпарадкаванае выкарыстанне граматычных форм. Напрыклад: *Лиса бегать под деревья. Дедушка Вову встречаются. Папа щенок подарит сынку*. Таксама ў групах даследавання назіраліся выпадкі сэнсавай неадэкватнасці складзеных сказаў: *Дети увидели деревянное дерево. Машина широко мчится по дороге*. Бяссэнсавыя сказы сустракаліся ў мове дзяцей з маторнай алаліяй у 5,1 % адказаў першакласнікаў і 7,5 % адказаў чацвёртакласнікаў і няўскладненым АНМ у 3,7 % і 5,3 % — адпаведна.

Аналіз параўнальнага вывучэння магчымасцяў пабудовы сказаў малодшымі школьнікамі з ЦПМ дазволіў вылучыць агульныя і спецыфічныя заканамернасці авалодання імі граматычным афармленнем выказавання. Да ліку агульных заканамернасцяў адносяцца наступныя.

- Вучні пачатковых класаў з ЦПМ абмежаваны ў выкарыстанні розных тыпаў сінтаксічных канструкцый. Яны карыстаюцца простымі неразвітымі ці маларазвітымі сказамі. На працягу пачатковага навучання ў школе ў даследуемых мяняюцца суадносіны паміж ужываннем простых развітых і неразвітых сказаў, г. зн. мае месца тэндэнцыя да выкарыстання разгорнутых граматычных канструкцый. Але пры пабудове развітых

сказаў вучні з ЦПМ часцей за ўсё выкарыстоўваюць вербальныя стэрэатыпы і штампы.

- Характар выказванняў дзяцей з ЦПМ, структура складзеных імі сказаў, паспяховасць у аперыраванні лексічнымі і граматычнымі адзінкамі залежаць ад умоў арганізацыі маўленчай дзейнасці. Найбольшую цяжкасць у граматычным афармленні сказаў, што праявілася ў значнай колькасці аграматычных выказванняў, вучні мелі пры аднаўленні дэфармаваных сказаў, а таксама пры складанні сказаў па сюжэтных малюнках.

Да ліку спецыфічных заканамернасцяў авалодання граматычным афармленнем выказвання малодшымі школьнікамі з ЦПМ адносяцца наступныя:

- Міжгрупавыя адрозненні ў развіцці граматычнага ладу мовы, у авалоданні сінтаксічнымі канструкцыямі. Па паспяховасці выканання эксперыментальных заданняў можна размясціць дзяцей у наступным парадку (па меры ўбывання): вучні з дызартрыяй, ускладненай АНМ; з няўскладненым АНМ; з маторнай алаліяй.
- У вучняў з маторнай алаліяй і няўскладненым АНМ часцей чым у дзяцей з дызартрыяй, ускладненай АНМ, адзначаліся цяжкасці ў аперыраванні паняційнымі сувязямі, што праяўлялася ў пабудове сказаў з парушаным, неадэкватным сэнсам.
- У дзяцей з няўскладненым і ўскладненым АНМ да канца пачатковага навучання колькасць аграматычных сказаў у вуснай мове паніжаецца, у той час, як у вучняў з маторнай алаліяй назіраецца нарастанне аграматызму.

Названыя асаблівасці канструявання сказаў вучнямі малодшых класаў з ЦПМ вызначаюць неабходнасць дасканалай працы па ўзбагачэнні і дыферэнцыяцыі слоўнікавага запасу гэтых вучняў, па фарміраванні ўменняў аперыраваць паняційнымі і сінтагматычнымі сувязямі пры пабудове выказванняў. На працягу пачатковага навучання ў школе патрабуецца мэтанакіраваная лагапедычная праца па папярэджанні аграматызму. Разнастайнасць сімптаматыкі аграматызму дыктуе неабходнасць паглыбленага аналізу дадзенага расстройства ў розных катэгорый дзяцей з ЦПМ. Улік неаднароднасці парушэнняў граматычнага ладу мовы ў вучняў спецыяльнай школы неабходны для арганізацыі дыферэнцыраванай карэкцыйна-педагагічнай працы па папярэджанні і пераадоленні гэтых расстройстваў, для выбару аптымальных шляхоў развіцця іх камунікатыўных магчымасцяў.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Грабчикова Н. С.* Формирование коммуникативных умений младших школьников в процессе обучения русскому языку. Мн., 1998.
2. *Павлова О. С.* Формирование коммуникативной деятельности у детей старшего дошкольного возраста с общим недоразвитием речи: Автореф. дис. ... канд. пед. наук. М., 1998.
3. *Спирова Л. Ф.* Особенности речевого развития учащихся с тяжелыми нарушениями речи (I—IV класс). М., 1980.
4. *Жукова Н. С., Мастюкова Е. М., Филичева Т. Б.* Преодоление общего недоразвития речи у дошкольников. М., 1990.
5. *Ковшиков В. А.* Экспрессивная алалия: Учеб. пособие к спецкурсу. Л., 1985.
6. *Соботович Е. Ф.* Психолого-педагогические основы коррекции нарушения формирования грамматического строя речи у детей: Автореф. дис. ... д-ра пед. наук. М., 1984.
7. Формирование грамматического строя речи учащихся начальных классов школы для детей с тяжелыми нарушениями речи / О. Е. Грибова, Т. Б. Бессонова, Н. И. Ипатова и др. М., 1992.


## SUMMARY


*The article considers and analyses the grammatical construction of the sentence in junior pupils with different speech disorders. The manifestations of agrammatism in the process of various tests performing (sentence construction using basis words, topic pictures and unsystematic words) are characterized. The dynamics of syntactic constructions mastering in junior pupils with general speech delay from first to fourth forms are described. This study shows the general and specific features of sentence construction in research group of children.*